Справаздача 2022

# Мы — ІншыЯ

# ЗМЕСТ

**Уступнае слова** ........ **3**
**Пра нас** ........ **4**
 Каманда ........ 6
**“Іншыя” лічбы і факты** ........ **7**
**Наша дзейнасць** ........ **11**
 Настольная гульня “Веру — НеВеру” ........ 12
 Праект “ALL Inclusive 2.0” ........ 13
 Курс “Рабі смела!” ........ 17
**Планы** ........ **21**
**Як нас падтрымаць** ........ **22**
**Кантакты** ........ **23**

# Уступнае слова

**4 САКАВІКА 2022 ГОДА МЫ СТВАРЫЛІ НОВУЮ АРГАНІЗАЦЫЮ — ІНШЫЯ.**

Іншыя — гэта беларуская моладзевая арганізацыя, якая:

- працуе для Беларусі і для моладзі Беларусі;
- складаецца з маладых беларусаў_ак, якія жывуць у розных краінах.

У 2022 годзе мы шмат працавалі над стварэннем каманды, паляпшэннем працоўнай камунікацыі, пошукам эфектыўных працоўных інструментаў, клапаціліся пра сябе і надавалі шмат увагі псіхалагічнай падтрымцы каманды.

Досвед 2022 паказаў нам, што, нягледзячы на складаныя часы і цяжкія сітуацыі ў кожнага і кожнай з нас паасобку, **разам мы нашмат мацнейшыя за любыя абставіны** і здольныя ствараць новае і натхняльнае.

Мы плануем, што 2023 год стане для нас годам аднаўлення сувязей з нашымі мэтавымі групамі і пабудовы партнёрскіх адносін з новымі арганізацыямі і ініцыятывамі! Зазірайце ў **раздзел "Планы"**, бо там напэўна ёсць нешта, што можа быць вам цікава!

# Пра нас

# МІСІЯ

САДЗЕЙНІЧАННЕ РАЗВІЦЦЮ ІНКЛЮЗІЎНАГА ЎЗАЕМАДЗЕЯННЯ ПАМІЖ РОЗНЫМІ ЛЮДЗЬМІ, ЗАСНАВАНАГА НА СКРАЗНЫХ КАШТОЎНАСЦЯХ

Член Беларускага нацыянальнага моладзевага савету "РАДА"

# КЛЮЧАВЫЯ КАШТОЎНАСЦІ

- Правы чалавека, у тым ліку ўзаемапавага, роўнасць, недыскрымінацыя
- Інклюзія
- Гендарная роўнасць
- Экапрыязнасць

# НАПРАМКІ ДЗЕЙНАСЦІ

- Прасоўванне скразных каштоўнасцяў
- Павелічэнне інклюзіўнасці прастораў і мерапрыемстваў
- Развіццё сацыяльнай інклюзіі*

*Змяненне адносін грамадства і паляпшэнне становішча стыгматызаваных і дыскрыміна-ваных груп праз павелічэнне бачнасці саміх людзей, іх праблем, інтарэсаў і поспехаў у публічнай прасторы.

# Каманда

**3 ПАРТНЁРЫ_КІ**

ядро каманды, якое адказвае за пастаноўку і дасягненне мэтаў і задач

**6 ПРЫХІЛЬНІКАЎ_ІЦ**

людзі, якія дапамагаюць арганізацыі дасягаць пастаўленых мэтаў і задач

# Цяпер мы жывём у розных краінах і часавых паясах, але каштоўнасці, якія нас аб’ядноўваюць, у любой сітуацыі дапамагаюць прыняць слушнае рашэнне

# “Іншыя” лічбы і факты

# “Іншыя” лічбы і факты

**1**
новая арганізацыя

**9**
чалавек у камандзе

**10+**
лічбавых інструментаў для працы

**1**
новы сайт

**3200+**
падпісантаў_ак у сацсетках

**∞**
бясконцая колькасць падтрымкі і любові

1 2

# “Іншыя” лічбы і факты

**10**
сустрэч групы псіхалагічнай падтрымкі для каманды

**5**
новых артыкулаў на сайце

**3** анлайн-курсы

**51** удзельнік_ца

**1**
інфармацыйная кампанія

**5000+**
распаўсюджаных друкаваных матэрыялаў

**8** мерапрыемстваў

**48** удзельнікаў_іц

1 2

# Наша дзейнасць

# Настольная гульня “Веру — НеВеру”



*Хочаце асобнік гульні ў сваю арганізацыю, ініцыятыву ці прастору? Напішыце нам па любым з кантактаў, указаных у канцы справаздачы і мы абмяркуем умовы і як перадаць вам адзін з надрукаваных экзэмпляраў!

“Веру — НеВеру” уяўляе сабою **набор з 50 картак з рознымі статыстычнымі фактамі аб Беларусі і нашым грамадстве.** Некаторыя з гэтых фактаў з’яўляюцца праўдай, некаторыя — не.

**Мэта гульні** — даведацца больш пра грамадства Беларусі і пагаварыць пра існуючыя ў ім праблемы. **Галоўнае тут — не перамога, а абмеркаванне.**

Гульня падыходзіць для любога фармату мерапрыемстваў і для любой кампаніі. Гуляць у яе могуць ад 2 да 20 чалавек як паасобку, так і камандамі, а працягвацца гульня можа ад 1 да 50 раўндаў. Гульня не патрабуе сталага_ую вядоўцу — можна выконваць гэтую ролю па чарзе. Гульня цалкам двухмоўная: правілы і ўсе карткі даступныя на рускай і беларускай мовах.

У 2022 годзе мы правялі **7 гульнятэк**, падчас якіх **39 чалавек** змаглі абмеркаваць дыскрымінацыю гуляючы.



# Праект “ALL Inclusive 2.0”

**Гэта наш доўгатэрміновы праект з Беларускім нацыянальным моладзевым саветам “РАДА”, які накіраваны на павелічэнне інклюзіўнасці прастораў і мерапрыемстваў.**

Адна з важных задач праекта — распрацаваць **рэкамендацыі па правядзенні інклюзіўных мерапрыемстваў.** Для гэтага мы правялі **даследаванне даступнасці** публічных мерапрыемстваў і прастораў для розных груп людзей, у якім прынялі ўдзел **больш за 200 чалавек**. Вынікі даследавання дапамаглі нам сфакусавацца на тым, што найбольш важна адлюстраваць у рэкамендацыях, а таксама падабраць для іх найбольш зручны фармат. Рэкамендацыі будуць апублікаваныя ў пачатку 2023 года.

У межах праекту ў студзені-красавіку 2022 года мы правялі **два анлайн курсы:**

- курс па вывучэнні інклюзіўнага падыходу для арганізатараў_ак мерапрыемстваў “ALL Inclusive”.
- курс па адвакатыўных кампаніях для прадстаўнікоў_ніц уразлівых груп “Актывуйся!”.

Курсы можна было праходзіць паралельна. Усяго мы атрымалі 30 заявак і **запрасілі на навучанне 27 чалавек.** На жаль, у тым ліку з-за таго, што падчас курсаў Расія пачала ваенныя дзеянні ва Украіне, удзельнікі_цы курса моцна дэматываваліся і іх актыўнасць значна знізілася.








**Пасля завяршэння курсаў 6 выпускнікоў_ніц атрымалі ментарскую падтрымку і дапамогу ў рэалізацыі сваіх ініцыятываў:**

- правялі серыю фізкультурных заняткаў для людзей сталага ўзросту,
- арганізавалі інклюзіўную экскурсію для невідушчых людзей і людзей са слабым зрокам,
- распрацавалі інклюзіўную палітыку для сваіх ініцыятываў,
- правялі ацэнку патрэбаў і на яе аснове арганізавалі ў Польшчы фонд дапамогі для беларусак, якія эмігравалі,
- распрацавалі план асветніцкай кампаніі па прыцягненні ўвагі да існуючых стэрэатыпаў адносна людзей з ментальнымі і псіхічнымі разладамі.

Для прасоўвання мэтаў праекта і дапамогі арганізатарам_кам мерапрыемстваў было апублікавана **8 артыкулаў** на нашым і партнёрскім сайтах, якія прачыталі больш за 1200 чалавек.

- Памылкі пры арганізацыі інклюзіўнага івэнта
- Ясная мова: навошта яна вашаму івэнту?
- Што рабіць з гендарнай няроўнасцю на івэнтах
- Хачу зрабіць інклюзіўны івэнт для людзей без слыху. Куды бегчы?
- Чаму пандус яшчэ не азначае інклюзію
- Што такое адвакатыўныя кампаніі і якімі яны бываюць
- “З кожным месяцам мы будзем губляць людзей, якія здольныя прасоўваць ідэалы інклюзіі”
- Флэшмобы, акаунты ў Tinder і інтэв’ю ў СМІ





# Курс “Рабі смела!”

**Восенню 2022 года ў межах напрамку па павелічэнні інклюзіўнасці прастораў і мерапрыемстваў мы правялі свой першы базавы анлайн курс для пачаткоўцаў у арганізацыі мерапрыемстваў “Рабі смела!”.**

У межах курса ўсю тэорыю мы даносілі праз кароткія відэа, а анлайн сустрэчы былі для практычных заняткаў. Курс доўжыўся 1,5 месяцы.

Курс аказаўся вельмі запатрабаваным! Мы атрымалі **50 заявак**, конкурс быў больш за 2 чалавекі на месца! У выніку мы абралі **24 чалавекі** для ўдзелу ў курсе.



1 2 3

# Вынікі

## 15 чалавек

распрацавалі канцэпцыю свайго мерапрыемства

## 2 чалавекі

паспелі правесці свае мерапрыемствы ў 2022 годзе

## 100% удзельнікаў_іц

- гатовы рэкамендаваць наш курс іншым
- адзначаюць, што курс быў карысны
- адзначаюць, што іх веды па арганізацыі мерапрыемстваў палепшыліся

## 17 чалавек або 70% скончылі курс



# Водгукі удзельнікаў_іц курса:

Той выпадак, калі не шкада ўкладзенага часу. Структурна, без вады і па справе + кіпа карысных матэрыялаў.

Я настойліва рэкамендую прайсці гэты курс, калі ты ўжо некалькі гадоў, як і я, тупаеш на месцы, не можаш зрабіць першыя крокі ў арганізацыі любога мерапрыемства, але табе вельмі хочацца яго правесці. Людзі, якія вядуць гэты курс, па-першае, вельмі беражліва да цябе ставяцца, па-другое, дапамагаюць прайсці цяжкасці і сумневы, выкарыстоўваючы выразны фідбэк і фразы падтрымкі. Гэта сапраўды дапаможа табе стаць больш упэўненым_ай, паверыць у сябе і, нарэшце, правесці сваё першае мерапрыемства!

Дзякуючы курсу (у тым ліку падрабязнаму разбору хатніх заданняў), я распрацавала план мерапрыемства, гатовы да ажыццяўлення! Адзін з найкарыснейшых курсаў, якія я праходзіла! :)

# Нашы планы

# Планы

У першай палове 2023 года мы плануем выпусціць **рэкамендацыі для арганізатараў_ак мерапрыемстваў** пра тое, як рабіць мерапрыемствы інклюзіўна, улічваючы патрэбы і інтарэсы самых розных уразлівых груп. Таксама ў нас запланаваны **Форум** па абмене практыкай працы з тэмай інклюзіі ў бягучай сітуацыі. Мы плануем аднавіць папаўненне **базы інклюзіўных практык** апісаннямі новых прыкладаў.

З 1 па 8 сакавіка 2023 года запланаваны **Тыдзень нулявой дыскрымінацыі,** у межах якога мы закранем тэму недапушчальнасці дыскрымінацыі па такіх прыкметах як мова і нацыянальнасць.

Таксама на працягу года ў нас запланаваны **выхад розных матэрыялаў** на тэму скразных каштоўнасцяў як на нашым сайце, так і ў сацсетках.

Сачыце за навінамі на сайце theothersby.org і падпісвайцеся на Instagram і Facebook, каб не прапусціць карысныя матэрыялы!

# Як нас падтрымаць

**Калі вам блізкія нашы каштоўнасці і падабаецца тое, што мы робім, вы можаце дапамагчы нам некалькімі спосабамі:**

**Распавесці** пра нашую працу сваім знаёмым. Цяпер, у складаны час, “сарафаннае радыё” з’яўляецца выдатным спосабам пашырэння дзейнасці!

Падтрымаць нашыя сацсеткі. **Лайк, каментар і падпіска** паўплываюць на алгарытмы сацсетак, і пасты ўбачыць большая колькасць людзей. Падпісвайцеся на нас у Facebook і Instagram і адзначайце ў пастах праз @theothersby.

**Чытаць артыкулы** на нашым сайце theothersby.org і дзяліцца імі з іншымі! Карысную інфармацыю не заўсёды лёгка знайсці, але наш сайт вам у гэтым сапраўды дапаможа.

**Наведваць нашыя мерапрыемствы.** Мы праводзім іх для таго, каб свет рабіўся лепшым. Калі вы прыходзіце на нашыя мерапрыемствы, то такім чынам дапамагаеце нам у нашай працы!

**Дзякуй усім, хто падтрымлівае нас і дапамагае!**
**Мы гэта вельмі шануем і працягваем нашую працу!**

# Кантакты

theothersby.org

info@theothersby.org

@theothersby

іншыЯ * Дазволь Іншым быць Іншымі

VšĮ "The Others BY"
Код рэгістрацыі 306096505